# ДУК “ВОРАНАЎСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА”

**01 верасня** да Дня ведаў Бастунская ІСБ прапанавала кніжную выставу “Вітаем беларускую кнігу!”, на якой былі прадстаўлены навінкі беларускай літаратуры і самыя лепшыя творы айчыннай прозы і паэзіі.

**06 верасня** да Дня беларускага пісьменства Місявіцкая СБ арганізавала гутарку “Вялікі сын Беларусі – Францыск Скарына”. Прысутныя даведаліся аб узнікненні і развіцці пісьменасці і кнігадрукавання на тэрыторыі Беларусі, пазнаёміліся з фактамі жыцця першадрукара Ф.Скарыны. Мультымедыйная прэзентацыя і кніжная выстава “Светлыя імёны Бацькаўшчыны” дапоўнілі расказ бібліятэкара.

**15 верасня** на Дзень адчыненых дзвярэй “Библиотека – волшебное место, где книгам не скучно, где все интересно” запрасіла Воранаўская дзіцячая бібліятэка. На мерапрыемства былі запрошаны вучні першых класаў групы падоўжанага дня. Іх пазнаёмілі з фондам дзіцячай літаратуры, перыядычнымі выданнямі, іміджавай комнатай “Обучайка”. Казачныя героі Лунцік і клоўн Лёлік запрасілі дзяцей на рухомыя гульні на свежым паветры. Дзеці атрымалі добры настрой, радасць ад знаёмства з бібліятэкай і кнігай.

## З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА КРАЮ
## (Да Году малой радзімы)

Гістарычны экскурс «Нет милей и краше  Вороновщины нашей» і конкурс малюнкаў арганізавала Пагародзенская СБ, гульню – вандроўку “Роднай зямлі шматгалоссе” для вучняў пачатковых класаў – Жырмунская ІСБ.

## ТАЛЕНТЫ ЛІТАРАТУРНАГА СЛОВА

Адзначаліся  літаратурныя юбілеі пісьменнікаў  і паэтаў. Віртуальная выстава “Талантливый рассказчик и умный сценарист” была прымеркавана да 115 – годдзя з дня нараджэння Льва Касіля, рускага савецкага пісьменніка, сцэнарыста. Віртуальная выстава “Мой любимый жанр – детектив”  - да 100 – годдзя з дня нараджэння Аркадзія Адамава, рускага савецкага пісьменніка, аўтара дэтэктываў.

Літаратурны партрэт “Паэтычны свет Людмілы Рублеўскай” быў арганізаваны да юбілея беларускай паэткі Л.Рублеўскай у Жырмунская ІСБ.

## Бібліятэчныя праекты, акцыі

З мэтай павышэння прэстыжу кнігі, чытання і прыцягнення карыстальнікаў у бібліятэку працавалі фотаконкурс  “#Книга ВКадре”, бібліятэчны блог “Библиотека без барьеров”. Працягваў працаваць маладзёжны праект “Маладзёжны ЧЫТАЙмер”.

У бібліятэках раёна прайшоў майстар-клас **“ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ КНІГІ”**. Усе жадаючыя пад кіраўніцтвам бібліятэкараў адрамантавалі старыя кнігі, замянілі патрапаныя вокладкі, навучыліся з падручнага матэрыялу рабіць арыгінальныя казачныя закладкі.

Літаратурная караоке **“МУЗЫКА ПАМІЖ РАДКОЎ”** сабрала на адкрытай пляцоўцы чытачоў бібліятэкі, якія пад музычнае суправаджэнне зачытвалі вершы вядомых пісьменнікаў, інтуітыўна улаўліваючы рытм верша і музыкі.

Квэст-гульня **“Я У ГЭТЫМ ПАСЁЛКЕ ЖЫВУ, Я ГЭТЫ ПАСЁЛАК ВЕДАЮ”** была прымеркавана да Года малой радзімы. Моладзь, падзяліўшыся на дзве каманды, спаборнічалі ў ведах гісторыі і культуры нашага раёна.

Напярэдадні важнай падзеі ў краіне супрацоўнікі бібліятэкі арганізавалі круглы стол **“ІДЗЁМ НА ВЫБАРЫ ЎПЕРШЫНЮ”**. Удзельнікамі мерапрыемства сталі маладыя

выбаршчыкі. Дыялог атрымаўся даверным і сяброўскім. Атрымалася данесці да кожнага ўпершыню галасуючага, што неабходна мець актыўную жыццёвую пазіцыю, заўсёды ў дзень выбараў прыйсці на выбарчы ўчастак галасаваць, так як вынік выбараў залежыць ад меркавання кожнага грамадзяніна.

У адзін дзень бібліятэкары ў розных кутках пасёлку прынялі ўдзел у ЛІБ/МОБе **“ЯК ПРАЙСЦІ Ў БІБЛІЯТЭКУ?”.** Яны падыходзілі да гараджан і задавалі ім пытанне: “А ці ведаеце вы, як прайсці ў бібліятэку?”. Тыя, хто правільна адказваў на пытанне, атрымлівалі ад бібліятэкараў паветраныя шарыкі. Тыя, каму цяжка было з адказам, таксама не заставаліся без увагі: супрацоўнікі ўручалі візіткі бібліятэкі з каардынатамі і падрабязным апісаннем усіх відаў паслуг, якія можна атрымаць у бібліятэках. У ходзе апытання, большасць жыхароў нашага раёна дакладна і выразна адказалі, дзе знаходзіцца бібліятэка, удакладнілі, што з радасцю наведваюць нашы мерапрыемствы.

Апытанне **“МОЛАДЗЬ І КНІГА: ШТО ЧЫТАЕ СУЧАСНАЯ МОЛАДЗЬ”** прайшло з мэтай вывучэння запытаў чытачоў. Супрацоўнікі бібліятэкі праводзілі апытанне сярод гараджан з пытаннем: “Чытаць гэта….”.

На працягу ўсяго праекта, удзельнікам мерапрыемстваў выдаваліся нумаркі, якія ў наступным ўдзельнічалі ў латарэі «Шчаслівы нумарок».

Завяршыўся праект бібліятэчнай тусоўкай **“ЁСЦЬ КАНТАКТ”**, дзе былі ўзнагароджаны самыя актыўныя ўдзельнікі мерапрыемстваў. Працавала выстава “Кніжныя ФАРБЫ лета”. Упрыгожылі закрыццё праекта госці з Віцебска — Фарбы Холі!

## РАБОТА З ДЗІЦЯЧЫМ ЧЫТАЧОМ.

Гучныя чытанні “Давайте знакомые книги откроем” для выхаванцаў дзіцячага сада арганізавала бібліятэкар Гіркаўскай СБ. Маленькія слухачы даведаліся шмат новага і цікавага, падзяліліся сваімі ўражаннямі, расказалі аб сваіх любімых героях і кнігах.

Забалацкая ІСБ запрасіла маленькіх чытачоў дзіцячага сада акунуцца ў свет казак, арганізавала гучныя чытанні “В гости я к себе зову сказку – сказочку мою”.

Бібліятэкар Больцініцкай СБ арганізавала на свежым паветры ў парку аг.Больцінікі гульню “Разам з кнігай я расту”, гульнёвую праграму “Лета мыльных пузыркоў”, падчас якой дзеці адказвалі на загадкі аб мыльных пузырах і шарах. А падчас літаратурнага квэсту “Героі” дзеці змаглі адправіцца ў захапляючае падарожжа па бібліятэцы, адгадывалі любімыя творы, пабывалі ў ролі літаратурных герояў і самастойна афармілі выставу “Любімыя кнігі! Любімыя героі!”. Таксама правяла гутаркі “Кніга - дарадчык, кніга - сябар”, “Бяспека – залог жыцця”, гадзіну загадак “Эрудыт”, арганізавала ваенна - патрыятычную гульню “Зарница”.

На кніжны пікнік “З кнігай на прыродзе” запрасіла Бастунская ІСБ, дзе юныя чытачы ўдзельнічалі ў літаратурных гульнях і конкурсе загадак, пазнаёміліся з кніжнай выставай. Таксама запрасіла на віктарыну “Лета ў загадках”. Дзеці з задавальненнем адгадвалі загадкі, чыталі вершы пра лета. Працавала выстава “Летняя палітра”.

“Прачытаў – спадабалася, раю іншым!”. Пад такой назвай стартавала акцыя ў Радунскай ГПБ. Юныя чытачы маюць магчымасць выбраць кніжкі не толькі з кніжных паліц, але і з “дрэва мудрасці”. А на “дрэве мудрасці” дзеці размяшчаюць тыя кніжкі, якія ім спадабаліся і якія яны раяць прачытаць іншым. Дзеці і падлеткі з інтузіазмам далучыліся да акцыі і размяшчаюць прачытаныя імі кнігі. Радунская ГПБ таксама прапанавала выставу – прагляд “Апетытнае чытанне», урок бяспекі «Віртуальная агрэсія». Для школьнікаў старэйшага ўзросту арганізавалі экалагічную экспедыцыю «Чем можем, природе поможем», кніжна – ілюстрацыйную экспедыцыю «Школа! Школа! Школа!».

Гульня “Бяспека ў летні час” (Жырмунская ІСБ) праведзена з мэтай папярэджання дзіцячага траўматызму і небяспечных выпадкаў у летні перыяд.

Дзень інфармацыі “Дзіцячыя кнігі – юбіляры 2020г.” прайшоў у Беняконская СБ – музею этнаграфіі.

Выставы – прагляды “Сустрэчы з беларускай казкай”, “Чытаем – веды набываем”, “Девчонки и мальчишки - читаем эти книжки!" прапанавала чытачам Пагародзенская СБ, Працавала летняя чытальная зала пад адкрытым небам “Родныя казкі на ўсе часы”.

## СЯМЕЙНАЕ ВЫХАВАННЕ

На вечар сямейных рэліквій “Хусткі з бабулінага куфэрка” Радунская ГПБ запрасіла паважанага чытача Шумскую Г.В., якая расказала пра свой скарб - хусцінкі, якія сабраны ў яе гардэробе. Ганна Віктараўна расказала гісторыю падораных хусцінак, пачаставала прысутных сваім пірагом. Дзеці ўдзельнічалі ў народных гульнях з хусцінкамі.

## ПРА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ.

У 2020 годзе бібліятэкамі працягваецца работа па бібліятэчнай праграме ***“Быць здаровым – гэта здорава” на 2016-2020гг.***

Гутарку – дыялог “Пяць складаемых здароўя” арганізавала Пераганцаўская СБ.

## ДЗЕНЬ ЕЎРАПЕЙСКАГА НАСЛЕДДЗЯ

Да Дня еўрапейскага наследдзя Воранаўская дзіцячая бібліятэка ладзіла кніжную выставу і агляд літаратуры “Культура Гродзеншчыны: факты, падзеі, асобы”. На мерапрыемства былі запрошаны вучні 7-8 класаў.

У літаратурную гасцёўню “Беларусь і культурная памяць Еўропы” запрасіла Радунская гарпасялковая бібліятэка навучэнцаў ДУА “ Радунская СШ”. Аматараў паэзіі і прозы пазнаёмілі з жыццём і творчасцю польскіх класікаў беларускага паходжання А.Міцкевічам і Э.Ажэшка. Гучалі вершы і ўрыўкі з паэм А.Міцкевіча, у тым ліку на польскай мове. Удзеньнікі мерапрыемства віртуальна наведалі музеі і месцы, дзе ім установлены помнікі.

Кніжная выстава – прагляд “Па старым вулачкам Гародні” арганізавана ў Канвелішскай СБ, гутарка “Гісторыка – культурная спадчына Беларусі” - Беняконскай СБ – МЭ.

## 1 ВЕРАСНЯ - ДЗЕНЬ ВЕДАЎ

Пазнавальны ўрок “Я вырос здесь, і край мне этот дорог” прайшоў ў Воранаўскай дзіцячай бібліятэцы. На мерапрыемства былі запрошаны вучні 6 “Е” класа, якім паведалі пра паходжанне назвы пасёлка, пра гістарычнае мінулае нашага краю, пра знакамітых людзей Воранаўшчыны. Нагадалі, што ў кожнага чалавека ёсць свая Радзіма – край, дзе ён нарадзіўся, дзе ўпершыню пазналі смак хлеба і пах кветак, і дзе ўсе здаецца асабістым, родным і дарагім кожнаму чалавеку.

На пазнавальны ўрок “Па дарозе ведаў” вучняў 9 “Г” класаў запрасіла Воранаўская раённая бібліятэка. Падчас мерапрыемства падлеткі даведаліся аб гісторыі гэтага свята і аб тым, як праходзіць Дзень ведаў у розных краінах. Удзельнікі мерапрыемства адказвалі на пытанні віктарыны.

Візіт да першакласнікаў “Першы школьны званок – кліча нас на ўрок” ажыццявіла Канвелішская СБ.

## Адзіны Дзень бяспекі

У рамках Тыдня бяспекі Воранаўская дзіцячая бібліятэка і Радунская ГПБ арганізавалі сустрэчу з работнікам МНС Хлюстам В.Ю., інспектарам прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю. Урок бяспекі “Спички детям не игрушки» (Радунская ГПБ) паказаў, што веды па бяспецы не бываюць лішнімі. Вучні 3-4 класаў УА “Радунская СШ” пазнаёміліся з мабільным прыдаткам “МЧС Беларуси. Помощь рядом”, замацавалі веды, выконваючы практычныя заданні па спецыяльнай праграме на камп’ютары, атрымалі памяткі і маленькія сувеніры.

На інфармацыйную гадзіну “Пусть знает каждый гражданин, пожарный номер 101!” з удзелам работніка МНС Хлюст В.Ю. былі запрошаны навучэнцы 3 класа УА “Воранаўская СШ”. У іміджавым пакоі “Обучайка” Вадзім Юр’евіч расказаў аб правілах паводзін пры найзвычайных выпадках, дзеці паглядзелі тэматычны відэаролік, прынялі актыўны ўдзел ў віктарынах, замацавалі атрыманыя веды.

## 6 ВЕРАСНЯ - ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

З мэтай папулярызацыі лепшых традыцый нацыянальнай культуры, друкаванага слова, духоўнасці беларускага народа аддзел абслугоўвання і інфармацыі запрасіў вучняў 11 класа ДУА “Воранаўская СШ” на бібліягадзіну “Не знікне цуд прыгожага пісьменства”. Размова вялася пра вядомага першадрукара, вучонага, асветніка і гуманіста, паэта і медыка Ф.Скарыну. А кніжная выстава “Промні асветніцтва” пазнаёміла з літаратурай, якая раскрывала гуманістычныя погляды і ідэі беларускіх мысліцелей Ф.Скарыны, К.Тураўскага, Е.Полацкай, С.Буднага, М.Гусоўскага. На прыканцы мерапрыемства віктарына замацавала атрыманыя веды.

Экскурс у мінулае “Прысвечана першадрукару” арганізавала Воранаўская дзіцячая бібліятэка. Дзеці акунуліся ў мінулыя часы, дзе жыў і працаваў першы беларускі асветнік і друкар – Ф.Скарына, пазнаёміліся з фактамі біяграфіі. Затым чыталі вершы, прысвечаныя першадрукару.

На тэматычную гадзіну “Асветнікі Беларусі” запрасіла Канвелішская СБ, агляд літаратуры “Промні асветніцтва” правяла Беняконская СБ – музей этнаграфіі.

## 11 ВЕРАСНЯ - 75 год з Дня ўтварэння Воранаўскай раённай бібліятэкі (1944)

“Шлях даўжынёй у 75…”. Пад такой назвай прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй, прысвечаны юбілею ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”. На свята прыйшлі не толькі ветэраны бібліятэчнай справы, але і чытачы, сябры бібліятэкі. У святочнай абстаноўцы з юбілеем павіншавалі першы намеснік старшыні райвыканкама Карповіч А.А., начальнік аддзела культурна – масавай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Давыдзік С.М., загадчык сектара культуры Воранаўскага райвыканкама Гагарын Г.М, старшыні раённых арганізацый і грамадскіх аб’яднанняў. Працавалі выставы “Путь длиною 75…”, “Делу книжному верны”, выставы творчых работ “Самаробная лялька”, “Героі кніжных старонак”. Кветкі, узнагароды, музычныя нумары – ўсё гэта склала святочны настрой прысутным.

Гульні, конкурсы, віктарыны прапанавалі работнікі Воранаўскай дзіцячай бібліятэкі падчас гульнёва – пазнавальнай праграмы “Іду на кніжкінай вуліцы”. На заканчэнне свята дзецям былі прапанаваны прагляд мультфільмаў 90-гадоў.

## 15 ВЕРАСНЯ - ДЗЕНЬ БІБЛІЯТЭК

Экскурсію ў бібліятэку пад назвай “Хто – хто ў гэтым доме жыве?” і выставу – прагляд “Бібліятэка прапануе” арганізавала Пераганцаўская СБ. У пазнавальнае падарожжа “Не исчезнет мир вовеки, пока на свете есть библиотека” запрасіла Місявіцкая СБ, працавала тэматычная выстава.

## АМАТАРСКІЯ АБ’ЯДНАННІ ЗАПРАШАЮЦЬ

Гістарычны віраж “Мінулае вучыць нас, як сёння жыць”. Пад такой назвай прайшло чарговае паседжанне аматарскага аб’яднання “Святліца”, створанага пры Беняконскай сельскай бібліятэцы – музей этнаграфіі. Літаратурную гульню па экалогіі “Прырода – калыска чалавека” арганізавала для ўдзельнікаў аб'яднання «Спадчына» Больцішская ІСБ; экалагічны ўрок “Калі дрэвы плачуць?” і гутарку “Мае любімыя кнігі пра жывёл” – Доцішская СБ; інфармацыйны час “Размова аб галоўным” для ўдзельнікаў аб'яднання «Грамадзянін» арганізавала Жырмунская ІСБ; гутарку “Традыцыйныя промыслы нашай мясцовасці” - для ўдзельнікаў аб'яднання «Скарбніца» Канвелішская СБ; удзельнікі аб'яднання «Знаходка» (Місявіцкая СБ) сабраліся на экалагічнае свята «Чырвонае лета – яркая песня прыроды»; гадзіну цікавых паведамленняў «Мой радавод» арганізавала Нацкай СБ; на ўрок экалогіі «Наш дом прырода» запрасіла Пагародзенская СБ; гульнёвы лабірынт і кніжкіну майстэрню арганізавалі ўдзельнікі аб'яднання «Калакольчык» Радунскай ГПБ; конкурс малюнкаў «Летнія забавы» і пасядзелкі ў фітаборы арганізавала для сваіх удзельнікаў Воранаўская ДБ.